*УДК 378.016:821.161.3*

# ТЭХНАЛОГІІ ВЫВУЧЭННЯ «ШКОЛЬНАЙ» МЕТОДЫКІ ЛІТАРАТУРЫ Ў СІСТЭМЕ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ-ФІЛОЛАГАЎ

**В. У. Праскаловіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*ул. К. Маркса, 31, 220030, г. Мінск, Беларусь, praskalovich@tut.by*

Аб’ектам разгляду дадзенага артыкула з’яўляюцца накірункі эфектыўнай арганізацыі прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў. Асаблівая ўвага надаецца выкарыстанню адукацыйнага патэнцыялу сучасных тэхналогій вывучэння «школьнай» методыкі літаратуры.

***Ключавыя словы:*** прафесійная падрыхтоўка; студэнты-філолагі; сучасныя тэхналогіі; методыка выкладання літаратуры.

# TECHNOLOGIES OF STUDYING «SCHOOL» METHODS OF LITERATURE IN THE SYSTEM OF PROFESSIONAL TRAINING OF PHILOLOGY STUDENTS

**O. V. Praskalovich**

*Belarusian State University,*
*K. Marx St., 31, 220030, Minsk, Belarus, praskalovich@tut.by*

The object of consideration of this article is the directions of effective organization of professional and methodological training of students-philologists. Special attention is paid to the use of the educational potential of modern technologies for studying the «school» methodology of literature.

***Key words:*** professional training; philology students; modern technologies; methodology of teaching literature.

Транспануючы на працэс падрыхтоўкі педагагічных кадраў вядомы лозунг: *«Тыя народы вырвуцца наперад у будаўніцтве свайго жыцця, якія навучацца найлепшым чынам падрыхтоўваць сваіх настаўнікаў»* (ЮНЕСКА. «Канцэптуальнае асэнсаванне і вызначэнне перспектыў развіцця адукацыі»), адзначым, што прафесійная некампетэнтнасць спецыялістаў з’яўляецца фактарам рызыкі сучаснай цывілізацыі. У рабоце педагогаў-філолагаў гэта фактар рызыкі для культуры цэлых пакаленняў і, што вельмі важна, лёсаў канкрэтных людзей, якіх навучае, выхоўвае і развівае агульнаадукацыйная і вышэйшая школа. У гэтай сувязі ак-

туалізуецца праблема прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнта-філолага да будучай практычнай дзейнасці.

Прафесійная падрыхтоўка студэнтаў-філолагаў ва ўніверсітэце складаецца з засваення імі тэорыі навучання літаратуры і з авалодання неабходнымі асобаснымі і прафесійна-метадычнымі ўменнямі, кампетэнцыямі будучага настаўніка-славесніка.

Тэарэтычную падрыхтоўку студэнты атрымліваюць на лекцыях, спецкурсах і спецсемінарах, замацоўваюць яе пры напісанні курсавых і дыпломных работ, у працэсе самастойнай пазааўдыторнай дзейнасці, пры падрыхтоўцы да калёквіумаў. Асноўнай формай навучання з'яўляецца лекцыйны курс, які фарміруе ў студэнтаў метадычнае мысленне – аперыраванне навукова-метадычнымі паняццямі, разуменне рэальнай вучэбнай сітуацыі і прымяненне метадычных ведаў і ўменняў у розных, нярэдка зменлівых умовах. Практычная падрыхтоўка студэнтаў рэалізуецца на практычных занятках, а таксама ў час вучэбнай, вытворчай (пераддыпломнай) педагагічнай практыкі.

На этапе ўдасканалення прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнта-філолага да будучай практычнай дзейнасці застаецца нявырашанай праблема праектавання новых адукацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць высокую якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы школьнай літаратурнай адукацыі.

Аб'ём артыкула не дае магчымасці ўявіць поўную панараму адукацыйных тэхналогій, найбольш папулярных сёння ў выкладанні такіх практыкаарыентаваных вучэбных дысцыплін прафесійнага кампанента, як «Методыка выкладання літаратуры», «Методыка выкладання мовы». Шматгадовы ўласны вопыт выкладання методыкі беларускай літаратуры ва ўніверсітэце наглядна сцвердзіў прадуктыўнасць такіх тэхналогій, як тэхналогія праблемнага навучання, дыдактычнай эўрыстыкі, гульнявыя і камунікатыўныя адукацыйныя тэхналогіі (арганізацыя навучання ў форме дыспуту, дыскусіі, эўрыстычнай гутаркі, брэйнстормінгу (мазгавога штурму, мазгавой атакі), круглага стала і інш.), інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, суб'ектнаарыентаваныя тэхналогіі, тэхналогіі QR-кодаў, тэхналогія лічбавага (электроннага) партфоліа (Digital portfolio) і інш.

Коратка спынімся на некаторых тэхналогіях вывучэння «школьнай» методыкі літаратуры і структурна-зместавых лініях прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў.

Ва ўстановах вышэйшай адукацыі ўсё большую папулярнасць набываюць такія педагагічныя метады і тэхналогіі, якія ствараюць умовы для станаўлення асобы студэнта і яе паспяховай адаптацыі ў сучасным ін-

фармацыйным грамадстве. Інавацыйны патэнцыял будучай адукацыі звязваецца з тэрмінам «змешанае навучанне» (blended learning). Гэта сучасная адукацыйная тэхналогія, якая аб'яднала элементы класна-ўрочнай сістэмы, электроннага навучання і дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій.

Па словах вядучага спецыяліста ў галіне змешанага навучання ў нашай краіне Л. В. Луцэвіч, змешанае навучанне – «дыдактычная адзінка (форма, тэхналогія, методыка), якая знаходзіцца на стадыі фарміравання, змадэляваная на аснове інтэграцыі і ўзаемнага дапаўнення традыцыйнага, электроннага і мабільнага навучання; прадугледжвае замяшчэнне часткі традыцыйных вучэбных заняткаў рознымі відамі інтэрактыўнага ўзаемадзеяння ў гібкім і даступным электронным і мабільным асяроддзі, адпавядае запытам і садзейнічае стымуляванню новага пакалення да самаадукацыі, павышэнню яго матывацыі і творчай актыўнасці [1]. Нельга не прызнаць, што ў найбліжэйшай будучыні забудзецца сам факт мяжы паміж вочным, завочным, дыстанцыйным, электронным і мабільным навучаннем. Мы будзем гаварыць, абгрунтоўваць і ўкараняць ва ўсе адукацыйныя практыкі парадыгму «навучання без меж».

Сучасныя сродкі навучання: флэшанімацыі, інтэрактыўныя дошкі, праца анлайн у інтэрнэце, 3D-адлюстраванні – сталі распаўсюджанымі ў адукацыйным працэсе. Выкарыстанне сучасных гаджэтаў дазволіць выкладчыку быць у адной прасторы са студэнтамі, у тым ліку віртуальнай.

Варта адзначыць магчымасці QR-кода як тэхналогіі для стварэння сучаснага адукацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае індывідуалізацыю, дыферэнцыяцыю і нагляднасць навучання. QR-код дазваляе карыстальнікам, якія валодаюць смартфонамі, планшэтамі, імгненна атрымаць самую розную інфармацыю на свае мабільныя прылады. У навучальных мэтах у падрыхтаваным намі вучэбным дапаможніку па методыцы выкладання беларускай літаратуры [2] закадаваны спасылкі, якія накіроўваюць студэнтаў на нацыянальны адукацыйны партал (e-vedy.adu.by), адукацыйны партал profil.adu.by, адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс (АІАР) eior.by, вэб-сайты (інфармацыйна-метадычны партал для настаўнікаў nastaunik.info; віртуальны кабінет беларускай мовы і літаратуры belkabinet.ucoz.ru), сайты настаўнікаў acenka.by, вэб-дадатак Moodle і інш. Выкарыстоўваем QR-код на *практычных занятках* (QR-коды прывядуць да вучэбных матэрыялаў: тэкстаў метадычных распрацовак урокаў беларускай літаратуры, відэазапісаў урокаў і пазакласных мерапрыемстваў па вучэбным прадмеце, розных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу (у тым ліку электроннага адукацыйнага рэсурсу) па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, web-гласарыя наву-

кова-метадычных тэрмінаў), у выглядзе закадаваных заданняў да *кантралюемай самастойнай работы студэнтаў* (з дапамогай сэрвісаў web 2.0 ствараюць «воблака слоў», інфаграфіку, інтэрактыўны глог-плакат, ментальныя карты, буктрэйлеры, кросэнсы, кластары), тэста, інтэрактыўных заданняў (з гэтай мэтай выкарыстоўваўся сэрвіс Learningapps.org) для *праверкі ведаў студэнтаў* па вывучаемай дысцыпліне і інш. Трэба адзначыць, што магчымасці прыцягнення QR-кода як адукацыйнай тэхналогіі практычна не абмежаваны [больш падрабязна гл.: 3].

Прынцыпова па-новаму арганізаваць вучэбны працэс дазволяць тэхналогіі рэфлексіўнага характару. У практыку прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі студэнта-філолага ўвайшоў рэфлексіўны аналіз урока (самааналіз, самаэкспертыза). У створаных квазісітуацыях (у абставінах будучай сферы дзейнасці) студэнты могуць ацаніць уласныя дасягненні.

На неабходнасць рэфлексіўнага асэнсавання студэнтамі вынікаў прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі скіравана рэфлексія «Мэтавызначэнне». Прагноз мяркуемых вынікаў вывучэння дысцыпліны «Методыка выкладання беларускай літаратуры» правяраецца па крытэрыях акроніма SMART (уласцівасці мэты): S – specific: канкрэтнасць; M – measure: вымяральнасць; A – achieveable: дасягальнасць; R – relevant: рэлевантнасць (рэалістычнасць); T – time-bound: абмежаванасць па часе. Рэфлексія «Мэтавызначэнне» дазволіць выкладчыку ацаніць актуальныя запыты студэнтаў-філолагаў на падрыхтоўку да рэальнага працэсу выкладання вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

З мэтай павышэння самарэфлексіі студэнтаў выкарыстоўваем тэхналогію лічбавага (электроннага) партфоліа (Digital portfolio). Партфоліа фарміруецца на працягу ўсяго перыяду прафесійна-метадычнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў ва ўніверсітэце. Партфоліа дазваляе студэнту зрабіць «бачным» свой адукацыйны маршрут не толькі ў межах асобнай вучэбнай дысцыпліны, але і ўсяго адукацыйнага працэсу [4]. Адбор кантэнту для лічбавага партфоліа з пункта гледжання практычнай скіраванасці навучальнага матэрыялу раскрываецца ў комплексе паказчыкаў, якія тычацца вынікаў адукацыйнай дзейнасці студэнтаў. Структура партфоліа можа быць варыятыўнай, намі вылучаны наступныя блокі:

– прэзентацыйны блок (змяшчае персанальную інфармацыю пра студэнта, яго візітную картку ў выглядзе прэзентацыі, відэароліка);

– нарматыўны блок (нарматыўна-прававое, навукова- і вучэбна-метадычнае забеспячэнне працэсу школьнай літаратурнай адукацыі);

– блок даследчых/творчых праектаў (метадычнае эсэ, анатацыі, рэцэнзіі, дыдактычныя сцэнарыі, тэхналагічныя карты, відэазапісы ўрокаў, пазакласных мерапрыемстваў па вучэбным прадмеце і інш.);

– блок інфармацыйна-прадметных рэсурсаў (фарміруецца з інтэрнэт-рэсурсных баз, педагагічных сайтаў і парталаў настаўнікаў-практыкаў);

– інтэрактыўны блок (матэрыялы, размешчаныя на адукацыйным партале філалагічнага факультэта БДУ; вэб-дадатак Moodle).

У якасці прылады для стварэння Digital portfolio «Партфоліа будучага настаўніка-славесніка» студэнты выкарыстоўваюць сэрвіс Google–Sites.google.com.

Як бачым, лічбавае (электроннае) партфоліа ўтрымлівае сістэматызаваны матэрыял па адпаведнай навукова-практычнай галіне ведаў, што забяспечвае перадусім «творчае і актыўнае… авалодванне ведамі, уменнямі і навыкамі ў гэтай галіне» [5].

У перыяд пераддыпломнай педагагічнай практыкі выкарыстоўваецца суб'ектнаарыентаваная тэхналогія, падчас якой кожны студэнт праходзіць свой індывідуальны маршрут ад самадыягностыкі і самааналізу гатовасці да выканання прафесійных функцый, мэтавызначэння і планавання да самаацэнкі дасягненняў пры падвядзенні вынікаў практыкі, карэкціроўкі і пастаноўкі мэт і задач на наступную практыку [6, с. 147–160].

Такім чынам, вылучаныя намі тэхналогіі не могуць быць прызнаны вычарпальнымі. Яны падаюцца найперш з улікам «высокатэхналагічнасці» як ключавой характарыстыкі сучаснага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя і стратэгічнай мэты методыкі выкладання беларускай літаратуры як навукова-педагагічнай дысцыпліны: падрыхтаваць студэнтаў-філолагаў да самастойнай прафесійна-педагагічнай дзейнасці ў навучальных установах рознага тыпу. Пры гэтым адзначым, што тэхналогіі вывучэння «школьнай» методыкі літаратуры задаюць тактыку рэалізацыі стратэгічнай мэты.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Луцэвіч Л. В.* У трэндзе – змешанае навучанне [Электронны рэсурс] // Настаўніцкая газета. URL: https://nastgaz.by/u-trendze-zmeshanae-navuchanne (дата звароту: 20.04.2021).

2. *Праскаловіч В. У.* Методыка выкладання беларускай літаратуры. Практыкум: вучэб.-метад. дапам. Мінск: БДУ, 2022.

3. *Кушаль К. Д.* QR-код і яго выкарыстанне ў адукацыйным працэсе // Аксиология филологического образования в контексте подготовки педагога будущего :

материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 85-летию со дня рождения проф. Л. А. Муриной, Минск, 22–23 марта 2021 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: О. В. Проскалович (гл. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2022. С. 310–314.

4. *Засобина А.*, *Куклина Л.* Цифровое портфолио студента-заочника // Высшее образование в России. 2007. № 7. С. 80–82.

5. *Беляев М. И., Краснова Г. А.* Информационные и коммуникационные технологии в современном открытом образовании [Электронный ресурс]. URL: http//ido.edu.ru/open/ikt/3.htm/ (дата обращения: 21.02.2023).

6. *Байбородова Л. В., Артемьева Л. Н., Кривунь М. П.* Индивидуализация и сопровождение в образовательном процессе педагогического вуза [Текст]: монография. Ярославль : РИО ЯГПУ, Изд-во «Канцлер», 2014.